Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Гадзінтара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрэсу: іншагародняя — 20 к. місцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі паперэд тэкстам 1 р. — к. За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 к. Зь кожнага радка . . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за радок . . . 15 „ За кожны радок . . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'ы—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 74 (2262) Серада, 28-га сакавіка 1923 г.

СССР у барацьбе за мір.

Савецкі ўрад мае поўнае права гаварыцца дасягнутым посьпехам нашае делегацыі на падрыхтоўчай камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні ў Жэневе. Дзякуючы ўмелай тактыцы, вытрыманасьці і глыбокаму веданьню справы т. Літвінаву ўдалося дамагчыся максімуму таго, чаго ён мог дамагчыся. А ўласна, ён зруйнаваў загадзя складзеную змову перадаць савецкі праэкт разброеньня ў адну з шматлікіх падкамісій (дзе яго павінны былі пахаваць), прымусіўшы яго абмяркоўваць на пленуме камісіі. Ён выкрыў тых, якія ня хочуць разбройвацца, але заўсёды гавораць аб разброеньні. Ён загнаў у тупік жэнеўскіх «міратворцаў», выкрыўшы на ўвесь сьвет фальшывасьць і двудушнасьць такіх «прыхільнікаў» міру, як Англія.

Яшчэ ў часе свайго першага выступленьня ў Жэневе 19-га сакавіка т. Літвінаў высунуў перад сваімі праціўнікамі два пытаньні, ад адказу на якія нельга было ўхіліцца. Ці да, ці не. 1) „Ці згодна падрыхтоўчая камісія і канфэрэнцыя аб разброеньні,—заявіў ён,—пакласьці ў аснову сваёй далейшай працы прынцып усеагульнага і поўнага разброеньня ў працягу прапануемага намі тэрміну і 2) правесьці першы этап разброеньня з такім разлікам, каб ужо пасьля першага году ўскладніць, калі не зрабіць зусім немагчым, вядзеньне вайны. Толькі, калі на гэтыя пытаньні будуць дадзены ядвусэнсныя станоўчыя адказы, можна будзе распачаць дэтальнае абмеркаваньне савецкага праэкту канвэнцыі».

Нямецкая і турэцкая дэлегацыі зараз жа заявілі аб падтрыманьні савецкага праэкту неадкладнага разброеньня. У шырокай дыскусіі аб савецкім праэкце ўзяло ня менш 20-ці дэлегацый. Але асабліва ўвагі заслугоўвае выступленьне ангельскага прадстаўніка лёрда Кешэндэна. Ён добра вывучыў савецкі праэкт і нарашыў узяць яго за аснову свайго абдуманага выступленьня проці СССР у шырокім маштабе. Разглядаючы па пунктах нашыя прапановы, Кешэндэн даказваў, што яна прасякнута нерэальнасьцю і няшчырасьцю. Ён асабліва падкрэсьліваў, што ў нашай прапанове нічога не гаворыцца аб грамадзянскай вайне. Усё выступленьне лёрда мела пэўную мэту: 1) аслабіць сумленныя намеры савецкага ўраду, 2) апраўдаць варожую палітыку ангельскага кансэрватыўнага ўраду і 3) знайсьці саюзьнікаў у барацьбе проці нашага Саюзу.

Готкае было заданьне, і ня віна Кешэндэна ў тым, што т. Літвінаў скарыстаў яго ўласныя аргумэнты проці яго-ж, чым паставіў Англію ў няпрыемнае становішча. Аб гэтым гаворым ня толькі мы, так ацэньвае выступленьне т. Літвінава і чужаземны друк.

Мы хочам яшчэ толькі зьвярнуць увагу чытачоў на той факт, што галоўную ролю застрэльчыка проці СССР у Жэневе ўзяў на сябе ангелец, у той час як францускі прадстаўнік Клозэль абмежаваўся малазначнымі і непераконваючымі заўвагамі.

Дзьве прычыны ляжаць у аснове такога разьмеркаваньня роляў. Англія, як самы заядлы вораг СССР, не магла адмовіцца ад спакусу ўчыніць шкоду яго міжнароднаму становішчу.

Праз месяц у Францыі—выбары ў парлямант, і выступленьне францускага дэлегата проці савецкага праэкту разброеньня зрабіла-б кепскі ўплыў на выбаршчыкаў і ўзмацніла-б пазіцыю камуністычнае партыі і ўсіх наогул левых партый. Таму роля тарана была перададзена ангельцу.

Вынікі атрымаліся ня тыя, якіх чакалі ангельскія кансэрватары: жэнеўскія дэбаты надзвычайна ўзмацнілі міжнароднае становішча і прэстыж СССР. А падтрыманьне нямецкай дэлегацыяй нашага праэкту паказала, што савецка-нямецкі канфлікт не аказаў уплыву на савецка-нямецкія дачыненьні.

Ліквідацыя парляманту ў Літве.

Урадавая літоўская газэта «Летувос Айдас» сьцьвярджае вестку аб праэкце ўтварэньня дзяржаўнай рады, якая заменіць сучасны літоўскі парлямант. Дзярж. рада будзе інстытуцыяй выбарнай і зложана будзе з большасьці земляробаў, бо, як зазначае А. А., «Літва есьць дзяржава земляробчая». У радзе возьмуць удзел толькі «ўчцівыя і працавітыя грамадзяне ў сьпелым веку». Выбары будуць пасрэдныя. Валасны к-т будзе выбіраць прадстаўнікоў у акруговы к-т, а гэты далейшых прадстаўнікоў у дзярж. раду. У гарадох меншасьці выбіраюць таксама прадстаўнікоў у дз. раду.

Арышт 12-ці юга-слаўскіх камуністаў.

ВЕНА, 26-3. 21-га сакавіка на аўстрыйскай прыгранічнай станцыі Град паліцыя затрымала прыехаўшых з Загрэбы 12 югаслаўскіх камуністаў, якія накіроўваліся ў Вену. Аўстрыйская паліцыя, якая заявярае, што затрыманыя ехалі ў Вену „для ўдзелу ў палітычнай канфэрэнцыі", пад вартаю накіравала іх назад на югаслаўскую прыгранічную станцыю Марыбор, дзе яны былі арыштаваны югаслаўскай паліцыяй.

Збойствы арыштаваных румынскіх камуністаў

ВЕНА, 24-3. З Бухарэсту паведамляюць, што арыштаваныя ў Орадэа-Марэ рабочыя сурова катаваліся ў паліцэйскім астрозе. Рабочыя арганізацыі Орадэа-Марэ, даведаўшыся пра катаваньні і збойствы, заявілі востры пратэст проці ўчынкаў паліцыі. З прычыны ўсеагульнага абурэньня начальнік паліцыі Орадэа-Марэ прымушан быў прызнаць, што катаваньні сапраўды былі, але «апраўдваўся» тым, што паліцыя ня можа абыходзіцца далікатна з камуністамі.

Выбары ў думу Саарскае вобласьці.

ВЭРЛІН, 26-III. Вынікі ўчарайшых выбараў у ляндрат (настанова, замяняючая абласны парлямант) Саарскае вобласьці паступныя: кампартыя атрымала 46.000 галасоў (на выбарах у 24 годзе кампартыя атрымала 40.00 галасоў); сацыял-дэмакраты атрымалі 43.000 галасоў (у 24 г.—46.000 галасоў); партыя цэнтру—128.000 галасоў—(118.000 галасоў); народная партыя—26.000 галасоў (37.000 галасоў), нацыяналісты—10.000 галасоў (0) хрыстыянскія сацыялісты—9.000 галасоў (0); гаспадарчая партыя—9.000 галасоў (10.000 галасоў); дэмакраты—4.000 галасоў (0).

Кампартыя атрымае 5 мандатаў (у ранейшым складзе ляндрату кампартыя мела таксама 5 мандатаў), сацыял-дэмакраты—5 мандатаў (6); цэнтр—14 мандатаў (14); народная партыя—3 мандаты (4); гаспадарчая партыя—1 мандат (1); нацыяналісты—1 (0) і хрыстыянскія сацыялісты—1 (0).

Савецкі праэкт канвэнцыі аб скарачэньні ўзброеньняў.

(Асноўныя палажэньні).

Парадак скарачэньня сухаземных сіл.

Праэкт зьмяшчае агульныя прынцыпы скарачэньня галоўных элемэнтаў вайсковае моцы кожнае дзяржавы. Падрыхтоўчая праца і практычнае ажыцьцяўленьне ўсіх захадаў, зьмешчаных у канвэнцыі, павінны быць ажыцьцёўлены ў працягу 2-х гадоў.

РАЗЬДЗЕЛ ПЕРШЫ праэкту канвэнцыі зьмяшчае прынцыпы скарачэньня асабовага складу сухаземных узброеных сіл і іх узброеньня і амуніцыі. У адносінах скарачэньня гэтых сіл дзяржавы падзяляюцца, у залежнасьці ад колькасьці іх рэгулярных армій, на 4 асноўныя групы. У аснову зьмяншэньня сухаземных узброеных сіл пакладзен аднолькавы каэфіцыэнт для ўсіх дзяржаў аднае і тае-ж групы. Так, дзяржавы групы «А» (армія больш 200.000) скарачаюць свае сухаземныя сілы напалову, групы «В» (больш 40.000) на трэцюю частку, групы «С» (іншыя дзяржавы) на чвэрць. Размер скарачэньня сухаземных сіл дзяржаў групы «Д», у якую ўвахо дзяць дзяржавы, разброеныя ў выніку сусьветнае вайны, павінен быць устаноўлен канфэрэнцыяй аб разброеньні.

Прадугледжваецца зьменшыць для кожнага ўзросту агульны лік вайсковаабучаных і афіцэраў, якія праходзяць вайсковую падрыхтоўку, а таксама забараніць у заканадаўчым парадку існаваньне якіх-небудзь грамадзкіх арганізацый, складзеных па вайсковым узоры, і вайсковае навучаньне цывільнага жыхарства ў парадку грамадзкае самадзейнасьці. Дзеля ўзброеньня сухаземных сіл дазваляецца пакінуць сучасную матар'яльную частку, апроч танкаў і звышдалёкае артылерыі. Яны зьнішчаюцца таксама, як і прылады хімічнае і паветранае вайны. Для армій усіх краёў застаецца колькасьць узброеньня, сурова абмежаваная патрэбамі арміі ў мірны час і адпавядаючая ліку ваенна-абучаных запасаў. Узброеньні, якія знаходзяцца на тэрыторыі кожнае дзяржавы звыш дазволенае ёй нормы, падлягаюць зьнішчэньню.

Аб скарачэньні марскіх узброеньняў.

РАЗЬДЗЕЛ ДРУГІ праэкту канвэнцыі датычыць прынцыпаў скарачэньня марскіх узброеных сіл. У адносінах скарачэньня марскіх сіл дзяржавы падзяляюцца ў залежнасьці ад разьмеру таннажу іх флёту на дзьве катэгорыі. Першая катэгорыя (флёт больш 200.000 тон) скарачае свае марскія сілы напалову, як па лічбе агульнага вадазьмяшчэньня ўсяго флёту, так і па лічбе вадазьмяшчэньня кожнае з катэгорый вайсковых караблёў; другая група—на чвэрць, па лічбе агульнага вадазьмяшчэньня ўсяго флёту.

Канвэнцыя прадугледжвае: неадкладна вывесьці са строю авіаносцы, разброіць і прывесьці іх у такі стан, які перашкодзіць выкарыстаць іх з ваеннаю мэтаю.

Далей праэкт канвэнцыі ўстанаўляе гранічныя нормы вадазьмяшчэньня кожнае катэгорыі вайсковых караблёў, катэгорыі суднаў, падлягаючых вываду, а таксама суднаў, якія пакідаюцца ў складзе флёту. Вайсковыя караблі, падлягаючыя вываду са складу флёту, разбройваюцца і прыводзяцца ў стан, які не дазволіць выкарыстаць іх для вайсковых мэтаў. Прадугледжваецца забарона будаваць вайсковыя караблі, апроч як для замены суднаў, пакінутых у складзе флёту пасьля скарачэньня. Канвэнцыя забараняе перадачу або продаж выведзеных з строю вайсковых караблёў іншым дзяржавам, а таксама ўстанаўляе адмову ад пабудовы вайсковых караблёў звыш устаноўленае для кожнае дзяржавы нормы, абмежаваньне калібру артылерыі для кожнае катэгорыі суднаў і колькасьці спарадаў і тарпэдаў і зьнішчэньне запасаў спарадаў і тарпэдаў звыш устаноўленых норм.

Вайскова-паветраныя сілы.

РАЗЬДЗЕЛ ТРЭЦІ датычыць разброеньня вайсковых паветраных сіл. Дзеля гэтага вайсковыя паветраныя судны разбройваюцца і прывозяцца ў такі стан, які не дае магчымасьці выкарыстаць іх для ваенных мэтаў. У адносінах скарачэньня паветраных сіл дзяржавы падзяляюцца, у залежнасьці ад ліку і складу іх паветраных сіл, на 3 групы. Дзяржавы групы «Е» (больш 200 самалётаў) скарачаюць свае паветраныя сілы напалову, дзяржавы групы «Н» (іншыя дзяржавы)—на чвэрць, з адначасным абмежаваньнем магутнасьці іх матораў. Захаваньне ў складзе паветраных узброеных сіл запасаў самалётаў і матораў дазваляецца звыш гэтых норм у разьмеры ня больш 25 проц. агульнага ліку правадзейных самалётаў пасьля іх скарачэньня.

Забараняецца ўзброеньне цывільных паветраных суднаў і прыстасаваньне іх для ваенных мэтаў. Прадугледжваецца зьнішчэньне запасаў авіацыйных бомб і інш., забарона іх вырабу і трыманьня на ўзброеньні ці ў запасе. Прадугледжваецца таксама скарачэньне асабовага складу вайсковых паветраных сіл адпаведна зьмяншэньню ліку пакінутых самалётаў.

Поўная забарона хімічнае вайны.

РАЗЬДЗЕЛ ЧАЦЬВЕРТЫ гаворыць аб зьнішчэньні ўсіх сродкаў і прыладаў хімічнага нападу і бактэрыялёгічнае вайны, як тых, якія знаходзяцца на ўзброеньні армій, так і тых, якія ёсьць у запасе ці вырабляюцца. Прадугледжваецца зьнішчыць абсталяваньне прамысловых прадпрыёмстваў, створаных для вырабу гэтых сродкаў, а таксама ратыфікаваць з боку ўсіх дзяржаў пратакол аб забароне хімічнае вайны, падпісаны ў Жэневе ў 1925 г.

Аб вайсковых бюджэтах.

РАЗЬДЗЕЛ ПЯТЫ. Вайсковыя бюджэты дзяржаў падлягаюць зьмяншэньню ў адпаведнасьці з скарачэньнем сухаземных, марскіх і паветраных узброеных сіл, якое ўстанаўляецца для кожнае групы дзяржаў.

Далей прадугледжваецца: выключыць з дзяржаўнага бюджэту сакрэтныя фонды, прызначаныя ў замаскаваным выглядзе на надзвычайныя выдаткі для спэцыяльнае падрыхтоўкі вайны і павялічэньня ўзброеньня; агалосіць выдаткі кожнае дзяржавы на ўтрыманьне ўзброеных сіл; скараціць вайсковыя бюджэты дзяржаў, пачынаючы ўжо з 1929 г., раўнадзежна са скарачэньнем іх узброеных сіл і матар'яльных сродкаў барацьбы. Пачынаючы з 1930 г., канкрэтныя гранічныя нормы фіскуюцца асобна для кожнае дзяржавы.

Кантроль над выкананьнем канвэнцыі.

Праэкт канвэнцыі зьмяшчае, урэшце, артыкулы пакоп міжнароднае пастаяннае кантрольнае камісіі, мэта якое: наглядаць за выкананьнем пастаноў канвэнцыі, устанаўляць захады ў адносінах да парушыцеляў канвэнцыі, распрацоўваць і вырашаць усе пытаньні, зьвязаныя са скарачэньнем узброеньняў. Памянёная камісія складаецца на парытэтных асновах з прадстаўнікоў заканадаўчых органаў і прафэсыянальных ці іншых рабочых арганізацый дзяржаў-удзельнікаў канвэнцыі. Прадугледжваецца ўвесьці ў склад камісіі таксама прадстаўнікоў міжнародных грамадзкіх арганізацый, якія ставяць сабе мэтаю барацьбу проці вайны і апраўдваюць гэтую мэту сваёю дзейнасьцю.

Пры МПКК (міжнароднай пастаяннай кантрольнай камісіі) засноўваецца міжнародны пастаянны камітэт экспэртаў з вайсковых, марскіх, паветраных і іншых спэцыялістаў, які ажыцьцяўляе сваю дзейнасьць пад кіраўніцтвам МПКК.

Праэкт канвэнцыі, апроч таго, прадугледжвае заснаваньне пастаяннага рабочага кантролю на вайсковай вытворчасьці, а таксама на вытворчасьці, якая можа быць выкарыстана для вырабу рэчаў узброеньня. Пастаянны рабочы кантроль, які ствараецца па ініцыятыве фабрычна-заводзкіх камітэтаў, ці адпаведных прафэсыянальных арганізацый, мае на мэце наглядаць за выкананьнем пастаноў канвэнцыі.

БУРЖУАЗНЫ ДРУК АБ ВЫНІКАХ ЖЭНЕУСКАЕ СЭСІІ.

„КАПІТАЛ ЛІГІ ПАТРАЧАК БЯЗ РЭШТКАЎ".

ВЭРЛІН, 26-3. Большасьць газэт агалашае паведамленьні аб заключным пасяджэньні падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні ў Жэневе пад загалоўкамі: „Жэнеўскае ашуканства", «Новы сабатаж разброеньня», «Крах разброеньня» і г. д.

Блізкая да Штрэзэмана «Тэгліхэ Рундшау» піша: «Гэтая гульня словамі і прапановамі на бясконцых пасяджэньнях робіцца пастунова нецярпімаю. Можна адбурваць сьвет некаторы час, але не бясконца. Калі Ліга Нацый ня мае магчымасьці ажыцьцёвіць урачыста абвешчанае ёю разброеньне, дык яна гэтым самым ставіць сабе крыж. З кожным днём зацікаўленасьць да спэктаклю разброеньня, рэжысэры і батлейкавыя артысты якога добра вядомы, паслаблянецца. Калі падрыхтоўчая камісія будзе спраўляць юбілей пяцісотага пасяджэньня, дык прамоўцу, які будзе яе вітаць, прыдзецца сьцьвердзіць, што капітал давер'я да Лігі Нацый патрачаны бяз рэшткаў.

«Форвэртс» адзначае, што новы савецкі праэкт аб частковым разброеньні ставіць заходнія дзяржавы ў цяжкае становішча, бо намячае тыя-ж шляхі разброеньня, якія прадугледжаны мірнымі ўгаворамі.

«Ротэ Фанэ» піша, што міліёны рабочых здабылі магчымасьць навочна пераканацца, што капіталісты трымаюць курс на новую бойню народаў.

ЦКАВАНЬНЕ САВЕЦКАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

БЭРЛІН, 26-3. Блізкая да колаў Лігі Нацый «Нэйе Цурыхэр Цэйтунг» вельмі востра выступае праці савецкага праэкту разброеньня і выказваецца проці ўдзелу савецкае дэлегацыі ў працы аб разброеньні.

ШЫЛА ВЫЛЕЗЛА З МЯШКА.

НЬЮ-ЁРК, 26-3. Карэспандэнты амаль усіх амэрыканскіх газэт у паведамленьнях з Жэневы адназгодна сьцьвярджаюць, што Літвінаў выкрыў няшчырасьць заходня-эўрапейскіх дзяржаў і нежаданьне разброіцца. Адназгодна сьцьвярджаюць, што капітал давер'я да Лігі Нацый патрачаны бяз рэшткаў.

Спатканьне т. Літвінава з Рушды-беем.

ЖЭНЕВА, 26-III. 26-га сакавіка тав. Літвінаў у працягу 2-х гадзін гутарыў з турэцкім міністрам замежных спраў Тэўфік-Рушды-беем, які ўвечары дае абед у гонар савецкае дэлегацыі.

27-га сакавіка савецкая дэлегацыя выяжджае з Жэневы праз Бэрлін.

ВІТАНЬ тав. ЛІТВІНАВУ АД ВУЧОНЫХ ЛЕНІНГРАДУ.

ЛЕНІНГРАД. Ленінградзкія вучоныя паслалі Літвінаву тэлеграму, у якой пішуць: «Навуковыя працаўнікі Ленінграду вітаюць у вашай асобе савецкі ўрад, выступіўшы з праграмаю ўсеагульнага разброеньня на канфэрэнцыі ў Жэневе. Навуковым працаўніком, інтарэсы якіх цалкам зьвязаны з мірным і беспарашкодным развіцьцём навукі і культуры, асабліва зьяўляецца блізкаю палітыка савецкага ўраду ў справе разброеньня».

АМЭРЫКА АДХІЛІЛА АНГЕЛЬСКУЮ ПРАПАНОВУ.

ВАШЫНГТОН, 26-III. Белы Дом (рэзыдэнцыя прэзыдэнта Злучаных Штатаў) заяўляе, што „прапанова аб абмежаваньні марскіх узброеньняў, зробленая ангельскай дэлегацыяй на сэсіі падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні,—манэўр, які ставіць мэту паставіць Злучаныя Штаты ў невыгоднае становішча". У заяве зазначаецца, што „ангельская прапанова ангельскага ўраду была адхілена Злучанымі Штатамі на леташняй канфэрэнцыі 3-х дзяржаў аб абмежаваньні марскіх узброеньняў" (на канфэрэнцыі 3-х дзяржаў бралі ўдзел Англія, Злучаныя Штаты і Японія).

У АПОШНІ ЧАС.

Буйнае адчыненьне польскага сойму.

Арышт і збойства ахранкай дэпутатаў апазіцыі.

ВАРШАВА, 27-III. Сёньня адчыніўся сойм новага складу. У сойм зьявіўся Пілсудзкі ў сайсковай форме і ў справаджэньні ад'ютантаў. Калі Пілсудзкі пачаў гаварыць, дык з лавак камуністаў, беларусаў, украінскіх радыкалаў і сялроба пачуліся воклікі: „Прэч фашысцкі ўрад Пілсудзкага!". Пілсудзкі паварачваецца ў левы бок залі і заяўляе: «Гэтыя паны будуць выкінуты».

Пры гэтых словах у залю ўрываецца міністр унутраных спраў Складкоўскі і за ім атрад паліцыі, часткай узброены вінтоўкамі. Складкоўскі паказвае на камуністаў, і крычыць паліцэйскім: «Возьміце іх!» Паліцэйскія выцягваюць з залі камуністаў Варскага, Сахацкага і Гаўрана (дэпутат Дамброўскага райёну), украінскіх радыкалаў Бачынскага і Жука, члена украінскай партыі працы Західнага і вызваленца Смола. У залі вялічэзны гоман. Нават пэпэсэўцы падымаюцца з месц і крычаць Складкоўскаму «ганьба!».

Старшыня фракцыі вызваленцаў Вайніцкі крычыць: «Добры пачатак!». Сярод публікі і ў дыплёматычнай лёжы пры гэтых сцэнах нэрвовы рух. Дэпутаты-пілсудчыкі ў процівагу пратэстам апазіцыі спрабуюць наладзіць маніфэстацыю ў гонар Пілсудзкага, што, аднак, ім не ўдаецца. Дэпутаты нацыянальных меншасьцяў стукаюць па пюпітрах.

У часе гоману Пілсудзкі стаіць на трыбуне і, урэшце, пачынае чытаць прамову. Затым па запрашэньню Пілсудзкага старэйшы (па ўзросту) дэпутат Бойка пачынае выконваць абавязкі часовага старшыні сойму.

Дэманстрацыя апазіцыі і расправа з ёй зрабілі вялікае ўражаньне, асабліва пасьля таго, як стала вядома, ттто паліцэйскія білі захвачаных дэпутатаў у калідорах сойму і што дэпутаты арыштаваны.

Пасьля прывядзеньня дэпутатаў да прысягі абвяшчаецца перарыў. Камуністычны дэпутат Біткэр у часе перарыву зьвярнуўся к часоваму старшыні сойму з патрабаваньнем зараз-жа вызваліць арыштаваных. Хвілін праз 20 зьявіліся арыштаваныя дэпутаты.

Камуністычны дэпутат Сахацкі ў гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў, што выведзеных з залі дэпутатаў зьбілі ў калідорах сойму і павялі ў памяшканьне ахранкі. Аднак, праз некалькі хвілін ім загадалі апрануцца і ў аўтамабілях павезьлі іх назад у будынак сойму.

У 8 гадзін 30 хв. пасяджэньне сойму аднавілася. Сойм прыступіў к выбарам старшыні.

Адзіны дзяржбюджэт у бюджэтнай камісіі ЦВК СССР.

БЮДЖЭТ СПРАЭКТАВАНЫ Ў СУМЕ 6035 МІЛІЁНАЎ РУБ.—ВЫДАТКІ НА АГРАМАДЖАНУЮ ГАСПАДАРКУ СКЛАДАЮЦЬ 1182 МІЛІЁНЫ РУБ.— У СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ БУДЗЕ ЎКЛАДЗЕНА 819 МІЛІЁНАЎ РУБ.

МАСКВА, 27-3. На пленуме бюджэтнае камісіі ЦВК СССР з дакладам аб праэкце адзінага дзяржаўнага бюджэту СССР на 1927-28 г. выступіў намесьнік наркома фінансаў СССР Кузьняцоў.

Спыняючыся коратка на папярэдніх даных аб выкананьні бюджэту за мінулы 1926-27 г., дакладчык падкрэсьліваў, што гэтае выкананьне перавысіла самыя лепшыя надзеі.

Бюджэт увогуле выкананы ў суме 5200 міліёнаў рублёў.

Бюджэт на 1927-28 год спраэктован саюзным СНК ў 6035 міліёнаў рублёў і перавышае зацьверджаны бюджэт мінулага году на 835 міліёнаў рублёў. Калі ўзяць пад увагу, што прырост нацыянальнага прыбытку Савецкага Саюзу вылічваецца Дзяржаўнай Плянавай Камісіяй СССР для бягучага году ў разьмеры 1600—1700 міліёнаў рублёў, дык выходзіць, што блізка паловы гэтага прросту ахапляецца прыростам бюджэту бягучага году. **З усіх краёў Эўропы МЫ МАЕМ найбольшы рост бюджэту.** Калі параўнаць запраэктаваны бюджэт Савецкага Саюзу з бюджэтам Расеі 1913 году, дык убачым, што **НАШ БЮДЖЭТ БОЛЬШЫ ЗА ДАВАЕННЫ БЮДЖЭТ НА 24 ПРОЦ.**

Бюджэт Савецкага Саюзу з году ў год адыгрывае ўсё большую і большую ролю, як фактар пераразьмеркаваньня народнага прыбытку. **Аграмаджаная гаспадарка** атрымала ў парадку пераразьмеркаваньня праз бюджэт у 1925-26 г. 141 міліён рублёў, у 1926 27 г. ужо 505 міліёнаў рублёў, а **ў 1927-28 г. павінна атрымаць 1182 міліёны рублёў.**

Характарызуючы галоўныя групы непадатковых прыбыткаў (прыбытку ад прамысловасьці, прыбытку ад банкаў, прыбытку ад лясоў і інш.), дакладчык падкрэсьліваў, што падсумаваньні ад гэтых прыбытковых артыкулаў сёлета зусім рэальныя. Галоўным артыкулам непадатковых прыбыткаў зьяўляюцца пазыкі. **Сёлета прыбытак ад пазык запраэктаваны ў суме 525 міліёнаў рублёў.** Калі папярэднія даныя аб выкананьні бюджэту СССР за мінулых 5 месяцаў гаспадарчага году гаворяць нам аб досыць нармальным ходзе непадатковых прыбыткаў, дык гэтага нельга сказаць аб прыбытках падатковых. У гэтым напрамку небясьпека ёсьць. Для таго, каб запраэктаваная ў бюджэце сума па прыбытковым падатку ў разьмеры 244-х міліёнаў рублёў была забясьпечана, саюзны СНК лічыць ўхваліў дэкрэт аб павялічэньні ападаткаваньня некаторых гушчаў буржуазіі.

Пераходзячы да характарыстыкі выдатковае часткі адзінага дзяржаўнага бюджэту, тав. Кузьняцоў са здаволеньнем адзначае, што «палажэньне аб мясцовых бюджэтах цалком апраўдала сябе на практыцы і сувязь дзяржаўнага бюджэту з мясцовымі разьвіваецца нармальна. З асобных артыкулаў выдаткаў мясцовых бюджэтаў тав. Кузьняцоў зварочвае ўвагу перш-наперш **НА ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА**, якое разьвіваецца даволі інтэнсыўна. Вялікае значэньне мае таксама шляхавае будаўніцтва.

Характарызуючы становішча рэспубліканскіх бюджэтаў, тав. Кузьняцоў напомніў, што ўрад у свой час даў дырэктыву павялічыць удзельную вагу агульнасаюзнага бюджэту ў адзіным дзяржаўным бюджэце. У гэтых адносінах ёсьць некаторыя посьпехі.

Далей тав. Кузьняцоў зазначыў, што фінансаваньне прамысловасьці павялічваецца сёлета на 29 проц. і складае 632 міліёны рублёў. Гэтае пашырэньне фінансаваньня дае магчымасьць павялічыць колькасьць рабочых, занятых у прамысловасьці, на 96 тысяч чалавек. На капітальнае будаўніцтва прамысловасьці прызначаецца 1.112 міліёнаў рублёў, з іх 914 міліёнаў—на скančэньне работ, распачатых у мінулыя гады, а рэшта—на новыя работы, якія распачнуцца сёлета. **На электрыфікацыю** па бюджэце сёлетняга году намечана выдаткаваць **136 міліёнаў рублёў.** Кватэрнае будаўніцтва патрабуе да сабе [illegible] сур'ёзных адносін. З моманту [illegible] зацыі камунальнага банку (у [illegible] на кватэрнае будаўніцтва [illegible] 914 міліёнаў рублёў, што [illegible] ла пабудову жылое плошчы [illegible] сячы сем'яў.

ФІНАНСАВАНЬНЕ ГАСПАДАРКІ сёлета [illegible] суме 819 міліёна[illegible] шыя павялічэ[illegible] сельская гаспа[illegible] дырэктывамі [illegible] ліне крэдыт[illegible] наты і [illegible] Між ін[illegible] ных [illegible] чымс[illegible]

УШАНАВАНЬНЕ 60-ЦІГ[illegible]

МАСКВА, 26-га сакавіка федэрацыя [illegible] вецкіх пісьменьнікаў у перапоўненай [illegible] Маскоўскага Мастацкага Акадэмічнага [illegible] атру ўрачыста ўшанавала 60 галоў[illegible] ця і 35 галоў пісьменьніцкае [illegible] Максіма Горкага.

Старшынствуючы Сямашка [illegible] урачыстую прамову: «Сёньня [illegible] жыцьця,—працоўныя намагаю[illegible] адзін, злучацца ў пажадан[illegible] ніцыя і здароўя бураг[illegible] які анавісьціў ко[illegible] было так пахо[illegible] Праз граніцы, вер[illegible] вецкае Расеі пра[illegible] скажуць: «Са [illegible]

У панскай Польшчы.

БАРАЦЬБА ЗА МАРШАЛКАЎСКУЮ БУЛАВУ.

ВАРШАВА, 26-III. Як вядома, Пілсудзкі прапановаў абраць старшынёю сойму сучаснага віцэ-прэм'ера Бартэля. Пры гэтым Пілсудзкі зазначыў, што абраньне Бартэля зьяўляецца адною з умоў супрацоўніцтва ўраду з соймам. Між тым пэпэсэўцы высунулі ўласную кандыдатуру Дашынскага, на якую украінцы і ранейшыя правыя групоўкі дэманстратыўна высоўваюць уласных кандыдатаў. Такім чынам, Бартэль ня мае патрэбнае колькасьці галасоў, каб прайсьці ў старшыні сойму.

«Глос Правды» заяўляе, што вылучэньне кандыдатуры Дашынскага, у процівагу высунутай пілсудчыкамі кандыдатуры Бартэля, створыць палітычны факт, з вынікамі якога нельга ня лічыцца.

ПРЭЗЫДЫУМ СОЙМАВАГА КЛЮБУ „УРАДАВАГА БЛЁКУ".

Старшынёй соймавага клюбу «Урадавага Блёку» выбран палкоўнік Славэк, віцэ-старшынямі: паслы Радзівіл, Лехніцкі, Касьнякоўскі, Бойко і сэн. Роман.

ПРЭЗЫДЫУМ СОЙМАВАГА КЛЮБУ ППС.

Старшынёю соймавага клюбу ППС выбран пасол д-р Марэк, віцэ-старшынямі: паслы Недзялкоўскі, Жулаўскі і сэн. Позвэр, сэкратарамі: Чапінскі, Цёпкоша і Заромба.

«БЕЗЬЗЯМЕЛЬНЫЯ».

«Вядомасьці Хлопске» налічаюць 300 «безьзямельных» міністраў, генэралаў, паслоў сойму, дырэктароў, ан[illegible]каў і інш., якія атрымалі па «ні[illegible]» [illegible]мельку ня менш, як [illegible]наў.

100.000 ЗЛОТЫХ ЗА МАНДАТ.

„Нойе Фольксцайтунг" паведамляе, што б. пасол сойму Кіршбраўн атрымаў прапазицыю заплаціць за мандат 100 тысяч злотых і тады ён яго атрымае. Справа ў тым, што партыйная група, да якой Кіршбраўн належыць—т. зв. „Агуда" на выбарах правалілася. Але Кіршбраўн стаіць і на дзяржаўным сьпіску „Урадавага Блёку". Рэдактар Сроцкі, які значыцца на гэтым сьпіску перад Кіршбраўнам, атрымлівае мандат, а Кіршбраўн не. Адсюль і прапазіцыя. Кіршбраўн адмовіўся ад прапазіцыі.

СЯРОД УКРАІНСКІХ ПАСЛОЎ.

„Свобода" паведамляе, што «УНДО» вядзе перамовы па справе ўтварэньня адналіцтва украінскага парлямантарнага прадстаўніцтва земель Зах. Украіны. Газэта прыпушчае, што ўдасца стварыць адналіцтве украінскае прадстаўніцтва, зложанае з 44 членаў, падзеленае на 3 фракцыі: нацыяналістычную, сацыялістычную і сельроб-лявіцу.

УСЮДЫ І ВА ЎСІМ „КАМУНІСТЫ".

„Дз. Віл." (№ 69) паведамляе, што ў Валожынскім пав. паліцыя арыштавала нейкага І. Дубніна, які разьвіваў па вёсках і, быццам, вёў камуністычную агітацыю. Як аказалася, Дубнік быў перадвыбарчым агітатарам беларускай «партыі сялян і работнікаў» (групы Яніі Станкевіча, якую падтрымлівала санацыйная «адзінка»).

ЗАБАСТОЎКІ Ў ВАРШАВЕ.

У Варшаве выбухлі забастоўкі мужчынскіх краўцоў і на фабрыцы цукеркаў. У абодвых выпадках работнікі вымагаюць падвышкі платы і выплаты залегласьцяў.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ АДОЗВЫ.

Гэтымі днямі, як паведамляе „Дз. Віл." (№ 69), у некалькіх масоваськах Гадуцінскай воласьці былі раскіданы камуністычныя адозвы на беларускай мове. Адозвы заклікалі вымагаць звальненьня арыштаваных па справе Грамады.

ПОЛЬСКІЯ АДМІНІСТРАТАРЫ.

«Роботнік» [№ 84] апісвае паводзіны Кобрынскага старасты:

„18 сакавіка г. г. Кобрынскі староста Якуб Сарнецкі прышоў п'яны на пошту з скаргай на паштовых служачых... і зрабіў карчэмную авантуру. Ён накінуўся на пэрсанал пошты з лаянкамі: „лайдак", „хуліган", „дурань" і іншымі, яшчэ менш шуканымі эпітэтамі. Усю пошту абляў так, што ня можна па

Перад вясеньняй сяўбой.

Аб кантрактацыі насеннага матар'ялу па БССР у 1928 годзе.

ПАСТАНОВА ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ ПРЫ СНК БССР.

Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя разьмеры кантрактацыі насеваў культур на насеньне:

а) капюшына	— 2000	гакт. в выхадам	прадукцыі	— — — — 14000 пуд.
б) сэрадэля	— 300	» »	»	— — — — 9000 »
в) лубін	— — 1500	» »	»	— — — — 45000 »
г) карм. буракі	— —	» »	»	— — — — 1000 »
д) ячмень—півавар.	800	» »	»	— — — — 24000 »
е) лён-даўгунец	2000	» »	»	— — — — 20000 »

2. Разьмеркаваньне пасеўнай плошчы, падлягаючай кантракцыі, вытварэцца:

а) паміж акругамі—НК Земляробства на ўзгадненьні з Белсельсаюзам,

б) па асобным райёнам—Акрэа—супольна з акрсельсаюзамі.

3. Устанавіць наступныя разьмеры авансаваньня кантракцыі насеваў на насеньне:

	Для заможн. гаспадарак	Для сярэдн. гаспадарак	Для бядазнк. гаспадарак
а) на капюшыне на гэкт.	40 руб.	50 руб.	60 руб.
б) „ сэрадэлі „ „	25 „	30 „	35 „
в) „ лубіну „ „	17 „	20 „	23 „
г) „ ячменю півавар. і буракам	17 „	20 „	23 „
д) „ лёну-даўгунцу	10 „	12 „	14 „

4. Патрэбныя для правядзеньня кантракцыі сродкі павінны вылучыць:

а) для лёну—24000 р.—Дзяржбанк,

б) для астатніх культур—Белсельбанк: на капюшыну—100000 руб., сэрадэлю—9000 р., лубін—30000 р., кармавыя буракі—5000 р і півавар. ячмень—16000 р.

5. Здача пастаўнікамі закантрактаванага матар'ялу павінна вытварацца ў наступных тэрмінах:

а) капюшына—да 15-га студзеня 1929 г;

б) сэрадэля і буракі—да 1-га сьнежня 1928 г.;

в) лубін—да 1-га сакавіка 1929 г.;

г) ячмень і лён—у тэрміны, устаноўленым пастановай Эканамічнай Нарады ад 5-III—28 г. (прат. № 8 п. 11).

6. Цэны для разрахунку з пастаўнікамі за закантрактаваныя матар'ялы ўстанавіць на вышэй наступных (за пуд);

а) капюшына—14 руб.

б) сэрадэля - 2 руб.

в) лубін—1 руб.

г) кармав. бурак.—10 руб.

д) півавар. ячм.—1 р. 40 к.

е) лён-даўгунец—2 руб.

Канчатковыя цэны сваячасова ўстанаўляюцца НКГандлю па ўзгадненьні з НКЗемляробствам з улікам ураджайнасьці і мясцовых умоў сельскае гаспадаркі.

Увага У выпадку калі НКГандлю на працягу існаваньня дагавору павысіць цэны на закантрактаваныя прадукты, дык гэта падвышэньне распаўсюджваецца на ўсю колькасьць насеньных матар'ялаў, як ужо зданых, так і падлягаючых здачы па дагавору.

7. Правядзеньне ўсёй апэрацыі па кантрактацыі насеннага матар'ялу вышэйпамянёных культур даручаецца Белсельсаюзу пад аснаўным кіраўніцтвам НКЗемляробства.

8. Пры кантрактацыі насеннага матар'ялу ўся аграномічная служба НКЗ-ва павінна аказваць дапамогу ў правядзеньні гэтае кампаніі Белсельсаюзам.

9. Усе іншыя пытаньні па кантрактацыі насеннага матар'ялу праводзяцца ў згодзе з пастановай Эканамічнае Нарады ад 5-III-28 г. (прат. № 8).

10. У мэтах атрыманьня найлепшага насеннага матар'ялу, прапанаваць НКЗемляробства, у граніцах тэхнічных магчымасьцей, правесьці апрабацыю насеваў, асабліва ў адносінах півавараванага ячменю, кармавых буракоў і лёну-даўгунцу на плошчы ня менш як 1.000 гэкт., прычым сродкі на правядзеньне гэтага мерапрыёмства павінны быць прадугледжаны НКЗемляробства пры распрацоўцы парадку ўтварэньня і скарыстаньня спэцыяльнага фонду агрыкультурнай дапамогі сельскай гаспадарцы, згодна пастановы Эканамічнае Нарады ад 5-III-28 году (прат. № 8, п. 6).

Старшыня Эканамічнае Нарады М. Карпінін.

Адказны сэкратар В. Крывіцкі.

15 сакавіка 1928 г.

Менская акруга перад сяўбой.

Зараз цімат гаворыць і пішуць аб належнай падрыхтоўцы і аб актыўным правядзеньні вясеньняй сяўбы, але сустракаюцца такія факты, якія сьведчаць аб слабай загатоўцы насеньня і ўгнаеньня.

У акрузе адчуваецца недахоп супэрфасфату, не хапае калійнай солі для бульбяных райёнаў.

Акруга патрабуе 50 тысяч пудоў аўсу, а ўсяго завезена 2 вагоны (патрабуецца яшчэ 44 вагоны), дарога зараз сапсуецца, гэта ўскладніць справу транспарту, наогул значна падвысіць накладныя выдаткі на насеньне.

Таксама дрэнна абстаіць справа з лубінам. Да гэтага часу загатоўлена толькі 33 тоны лубіну, што складае нязначную долю ўсіх запатрабаваньняў у гэтым насеньні. Акруга ня зможа задаволіць свае патрэбы ў лубіне загатоўкамі ў межах сваёй акругі, а трэба ўжыць захады да завозу лубіну з іншых райёнаў.

Што-ж датычыцца насеньня ячменю, кораньплодаў, капюшыны, сэрадэлі, вікі, а таксама і с.-г. нашыв, то акруга задаволена імі поўнасьцю. Крэдыты на ўсе галіны сельскай гаспадаркі ўжо пераведзены па месцы; па кантрактацыі лёну і ячменю крэдыты ўжо выдаюцца.

Трэба спыніцца крыху на кампаніі па ачыстцы насеньня. Гэта справа зараз паленшылася, але бяда ў тым, што па некаторых райёнах, напрыклад, па Лагойскаму, мала насенна-чысьцільных машын.

Калектыўнае будаўніцтва ў акрузе зараз значна ажывілася. Сёлета маюць быць арганізаваны да 40 с.-г. калектываў. Сярод насельніцтва можна заўважыць актыўны рух і зацікаўленасьць да гэтай справы. У адным толькі Койданаўскім райёне арганізуюцца 4 с.-г. калектывы, у Плешчаніцкім райёне польскае насельніцтва арганізуе некалькі калектываў.

Апроч гэтага, мае быць арганізавана да 32 малочных (10 т-ваў ужо зарэгістраваны), 3 садова-гародныя, 2 пчалярскія і некалькі лёнавых таварыстваў.

За таварную сельск. гаспадарку.

Вясна не за гарамі. Кожны селянін павінен падрыхтавацца да таго, каб яго поле было засеена, бо ад павялічэньня засеву залежыць уся эканоміка сельскай гаспадаркі. Калі-ж мы пагледзім на палі і лугі, балоты нашае Беларусі, дык ад жаху ў культурнага чалавека могуць пасівець валасы. На самай справе вялікія багацьці селянінам не выкарыстоўваюцца, ёсьць зямля, на якой хадзіла толькі нага чалавека, а рукі ня былі тут прыкладзены, ня гледзячы на тое, што з гэтае зямлі таксама можна атрымаць ураджай і не малы. Апроч гэтага, маюцца хмызьнякі і г. д. Ня прыходзіцца шмат гаварыць аб тым, што большасьць балотаў могуць стаць добрай ураджайнай зямлёю.

Але на ўсё гэта наш селянін не зьвяртае належнай увагі.

Наша краіна мае пераважна селянскі характар—нашая эканоміка цалкам залежыць ад сельскае гаспадаркі, развіцьцё якое знаходзіцца ў простай сувязі з добрай, умелай апрацоўкаю глебы і мэтазгодным скарыстаньнем працы і капіталу. Частка нашага селянства сама ня ведае таго, як рацыянальна паставіць гаспадарку.

Вось дзеля таго, каб пайсьці па шляху таварнасьці сельскае гаспадаркі, трэба, каб кожны селянін скарыстаў усё, што маецца ў яго руках: 1) усе землі, якія знаходзяцца пад балотамі апрацаваць і засеяць 2) раскапаць, раскарчаваць хмызьнякі і зрабіць з іх поле для засеву, 3) сенажаці апрацаваць так, каб мець магчымасьць атрымаць з дзесяціны больш сена, што дасьць магчымасьць павялічыць колькасьць жывёлы, а праз гэта можна мець больш гною для палёў.

Кожны селянін павінен вывяўць усе прычыны, чаму ён ня мае досыць хлеба для сваёй сям'і і што трэба рабіць, каб зьнішчыць гэта.

Па Беларусі да гэтага часу палова гаспадараў выключна мае спажывецкі характар, астатнія амаль што вядуць натуральную гаспадарку і толькі нязначная колькасьць таварную. Заставацца і надалей у такім становішчы нельга. Мы павінны пайсьці на шляху адніаўленьня таварнасьці сельскае гаспадаркі, імкнуцца ўсімі мерамі да засеву яравога кліну больш каштоўнымі культурамі і пашырыць засеў на нескарыстаных землях. Галоўную ролю ў сельскай гаспадарцы ў сучасны момант павінна адыграць калектывізацыя. Падзяленьне гаспадаркі, якое мае месца і да гэтага часу, павінна спыніцца, а то мы бачым якраз адваротнае. Мы павінны добра ведаць, што дробная гаспадарка сама сябе не апраўдвае, у той час як калектыўнае вядзеньне гаспадаркі дасьць магчымасьць скарыстаць машыны, культуру і г. д. ХУ-ты Зьезд УсеКП(б) даў дырэктыву па гэтым пытаньні, і мы павінны скарыстаць яе ў мэтах палепшаньня свайго жыцьця і наогул павялічэньня магутнасьці дзяржавы.

П. У. Калінін.

Пасёлкі пераходзяць на шматпольле.

(Лапіцкі сельсавет, Уваравіцкага райёну).

У зьвязку з правядзеньнем вясеньняй пасяўной кампаніі, Лапіцкі сельсавет разам з агранамам выпрацаваў плян правядзеньня кампаніі ў сваім сельсавеце. Водлуг гэтага пляну намечана адгатункаваць пасяўнога яравога збожжа 2500 пуд. і пратруціць 250 пуд.

Зьвернута ўвага на распаўсюджваньне гатункованага насеньня. На тэрыторыі сельсавету намечана разьмеркаваць аўса «Залаты Дождж» 700 пудоў і лёну-даўгунца 100 пудоў. Ня гледзячы на праведзеныя земляўпарадкаваньне, ужываньне гатункованага насеньня ў пасёлках праводзіцца слаба, бо сельсаветам у гэтых адносінах не вядзецца патрэбнага растлумачэньня. З гэтае прычыны, што на тэрыторыі сельсавету маюцца гаспадаркі, якія адчуваюць патрэбу ў насеньні, прадугледжана атрымаць насеньня на 500 руб. На тэрыторыі сельсавету маецца тры радавыя сялькі, якімі намечана засеяць у часе пасяўной кампаніі плошчу ў 350 дзесяцін. Сялянскім камітэтам узаемадапамогі набыты яшчэ дзьве радавыя сялькі, што дасьць магчымасьць плошчу, засеяную радавым пасевам, павялічыць. У некаторых пасёлках існуе трохполка, таму ў гэтую кампанію намечана ўвесьці шматпольны севазварот на плошчы ў 300 дзесяцін. У вясенньня-пасеўную кампанію намечана арганізаваць на тэрыторыі сельсавету 2 пасёлкавыя таварыствы, адно мэліяцыйнае, адно садова-гароднае.

Драбышэўскі.

Камітэты ўзаемадапамогі загатовілі 181 тысячу пудоў насеньня.

Зараз камітэты сялянскай узаемадапамогі БССР праводзяць узмоцненую падрыхтоўку да вясеньняй пасяўной кампаніі. Так, да 15-га сакавіка г. г. камітэтамі ўзаемадапамогі загатоўлена розага насеньня ў колькасьці 181.188 пуд. З гэтай колькасьці загатоўлена аўса—125.812 пуд., ячменю—19.684 пуд., грэчкі—12.442 пуд. і іншых культур—23.250 пуд.. Апроч гэтага, камітэты ўзаемадапамогі для закупкі насеньня маюць грашовы фонд у суме—95.224 руб. З усёй колькасьці насеньня ў кааперацыі закуплена—39.291 пуд. і ад Хлебапрадукту—10.176 пуд.

Плошчу засеву павялічваем на 2%.

(Крайскі сельсавет, Плешчаніцк. р.).

Перад пасяўной кампаніяй Крайскі сельсавет апрацаваў план, згодна якому знаходзіць магчымым у гэту кампанію павялічыць агульную плошчу засеву на 2 проц., пасеў кораньплодаў павялічыць на 18 проц., капюшыны на 10 проц., лубіну на 10 проц. і тэхнічных культур—лёну, канапель на 15 проц.

Трэба, на жаль, адзначыць, што наша насельніцтва, як з прычыны сваёй несьвядомасьці, так і з прычыны бедناсьці засявае ў большасьці неачышчаным насеньнем і нават з розным зельлем, адчаго і ўраджай бывае нізкі. Але маюцца і такія сяляне, якія ўжо зразумелі ўсю шкадлівасьць такога засеву і кожны раз перад сяўбой ачышчаюць сваё насеньне; зразумела, ураджай у такіх сялян значна вышэйшы. Сельсавет паставіў сваім заданьнем дапамагчы ўсімі магчымымі сродкамі ачысьціць насеньне прыблізна на 25 проц.

У працу па правядзеньню пасяўной кампаніі ўцягнуты ўсе масовыя арганізацыі і культурныя працаўнікі, асабліва настаўніцтва.

Селянін.

С.-г. крэдытная кааперацыя мала цікавіцца рэалізацыяй пазыкі.

РЭАЛІЗАВАЛІ ТОЛЬКІ НА 4798 РУБ.

Мазыр, 27-III. 18 таварыстваў сельска-гаспадарчай крэдытнай кааперацыі за ўвесь час рэалізавалі сялянскай пазыкі на 4798 руб. Сума вельмі нязначная, а між тым, с.-гасп. кааперацыя ў сваёй штодзённай працы сустракаецца з сялянствам і мела магчымасьць рэалізаваць куды больш.

РЭАЛІЗУЮЦЬ І БЯЗ НАС...

Магілеў, 27-III. 23 таварыствы с.-гасп. крэдытнай кааперацыі ўзяліся рэалізаваць сялянскай пазыкі на 22.670 руб., а дагэтуль рэалізавалі ўсяго на 4508 руб. Зусім не вялася праца па растлумачэньні сялянству карысьці для яго ад набыцьця аблігацый, а таму і выніці кепскія.

— Рэалізуюць і бяз нас,—відаць, разважалі працаўнікі кааперацыі.

НЕ СКАРЫСТАЛІ МАГЧЫМАСЬЦІ.

Бабруйск, 27-III. Сельска-гасп. крэдытная кааперацыя акругі ўзялася рэалізаваць сялянскай пазыкі на 37.550 руб. Пры добра настаўленай працы заданьне можна было выканаць поўнасьцю, але па апошніх вестках праз с.-гасп. крэд. кааперацыю рэалізавана толькі на 5694 руб. Трэба скарыстаць апошнія дні і заданьне выканаць, бо магчымасьць для гэтага ёсьць.

ПА АРТЫКУЛАХ.

(Замест фэльетону).

— Дзіўлюся я з вас, Міхаіл Пятровіч. Толькі на мінулым тыдні мы з вамі парыліся ў КК за нескарачэньне 20 процантаў выдаткаў. Учора мы, нарэшце, паслалі ў РСІ скарочаны каштарыс, а сёньня вы мне прапануеце зацьвердзіць новыя адміністрацыйныя выдаткі. Каштарыс ужо складзен? Грошай на выдаткі па артыкуле «адміністрацыйна-гаспадарчыя» няма?

— Няма, пацьвердзіў Міхаіл Пятровіч.—Толькі дазвольце запытаць, якія-ж гэта гаспадарча-адміністрацыйныя выдаткі?

— Як якія? Ды вось, хаця-б тры новыя шафы па 400 рублёў...

— Што вы, таварыш Пенька, шафы—не адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі, яны ідуць саўсім на іншым артыкуле. Гэта-ж вялікія шафы і мы іх прылічваем да капітальнага будаўніцтва. Гэта-ж маемасьць і досыць каштоўная...

— Мм... Ці-ж так. Ну, а тут: «на рэкляму вырабаў нашага заводу, з партрэтамі кіруючых працаўнікоў—975 рублёў». Гэта што? Таксама капітальнае будаўніцтва?

— Жартаўнік вы, таварыш Пенька. Гэта ідзе па арт. «незалежных выдаткаў».

— Чаму незалежных?

— Каб рынак нашу прадукцыю ведаў,—трэба? Каб набывалі нашы вырабы,—трэба? Значыць, рэкляму мы прымушаны даваць. Значыць, гэта ад нашай добрай волі не залежыць. Значыць, выдаткі незалежныя.

— Т-так. Ну, а далей? «Камандыроўка інжэнэра Глухава ў Маскву для пагодженьня з ВСНГ праэкту пляну перабудовы ўваходнай будкі ля заводскай брамы». Па арт. «выдаткі планаваньня?»

— Хэ-хэ. Такіх артыкулаў няма. Мы гэта па рахунку «непрадбачных выдаткаў» правядзем. Ніхто-ж ня мог прадбачыць, што родная цётка Глухава захвар... што будка разваліцца. Па тым самым артыкуле правядзем і „пасылку на курорт за кошт установы адказных працаўнікоў“.

— Гэта трэба правесьці па арт. «Ахова працы».

— Па „ахове працы“ мы правялі набыцьцё новай легкавой аўтамашыны.

— Ну, што-ж, зацьвярджаю. Ага, да рэчы. Мы-ж скарацілі 7 чалавек?

— Скарацілі, у нашых сьпісах на пэнсіі іх ужо няма.

— Чаму-ж яны сядзяць на ранейшых мясцох і пішуць?

— А гэта, бачыце, мы з трэстам дамовіліся. Трэст іх да сябе на службу ўзяў, а працуюць яны ў нашым памяшканьні, для нашага заводу і робяць ранейшую працу. У нас іх у сьпісах няма. А ў трэсьце яны ліквідацца, як выехаўшыя ў доўгатэрміновую камандыроўку. Мы за трэстаўскі штат не адказваем. Мы дырэктыву ўраду на 100 проц., г. зн. на 20 проц. выканалі.

П. Б.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

10 ПАЖАРНЫХ МАШЫН У ВЁСКУ.

Бабруйск, 27-3. У бліжэйшыя дні будуць атрыманы 10 пажарных машын, якія будуць разьмеркаваны паміж вясковымі пажарнымі дружынамі.

НОВЫ ЗАВОД У МАГІЛЕВЕ.

Магілеў, 27-3. Акрвыканкомам атрымана паведамленьне, што Беларускі Дзяржаўны Сьпіртатрэст узбудзіў хадайніцтва аб перадачы яму будынкаў Магілеўскага рафінацыйнага заводу пад выраб віна, з садавіны і ягад.

Работы мяркуецца распачаць у будаўнічы сэзон гэтага году.

РОСТ ПТАШНІЦКІХ Т-ВАЎ.

Магілеў, 27-3. Тры пташніцкія таварыствы зноў адчынены ў акрузе, у Лупалаўскім, Магілеўскім і Быхаўскім райёнах, сябры іх—жанчыны. Па акрузе ў хуткім часе намечана адчыніць яшчэ 6 такіх таварыстваў.

40 ВАГОНАЎ ВЫСЕВАК НА САКАВІК

Магілеў, 27-3. У сакавіку Саюз сельска-гаспадарчай кааперацыі павінен атрымаць 40 вагонаў высевак (10 вагонаў ужо прыбыло). Высеўкі разьмяркуюцца сярод малочных арцеляў і племянных жывёлаводных т-ваў, частка іх ідзе і ў крэдытныя т-вы для ўзмацненьня загатовак.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ КРАМНУЮ КАМІСІЮ.

Магілеў, 27-3. Магілеўскі рабочы кааператарыў з 25 сакавіка будзе праводзіць конкурс на лепшую крамную камісію. Да ўдзелу ў конкурсе прыцягваецца ўся маса пайшчыкаў. Конкурс працягнецца 2 месяцы.

КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ КАРОВУ.

Магілеў, 26-3. У Магілеўскім, Лупалаўскім і Клімавіцкім райёнах будуць праведзены пры малочных арцелях конкурсы на лепшую на ўдою карову, для чаго на прэміі вызначаецца па 120 руб. на кожны райён.

500.000 РУБ. НА ЖЫЛБУДАЎНІЦТВА.

Віцебск, 27-3. У бягучым годзе Беларускім Камунальным Банкам мяркуецца адпусьціць для жыльлёвага будаўніцтва па Віцебску доўгатэрміновага крэдыту ў разьмеры каля 400.000 р. і кароткатэрміновага крэдыту каля 100.000 руб. У першую чаргу банк будзе адпускаць крэдыт на новае будаўніцтва.

ІНВАЛІДНАЯ АРЦЕЛЬ ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ МАКАРОНУ.

Віцебск, 27-3. У Віцебску арганізавана новая інвалідная арцель на выпрацоўцы макарону, у якой будуць працаваць 30-40 чал. інвалідаў вайны. Арцель будзе перапрацоўваць да 2.000 пуд. пшанічнай мукі ў месяц. На абсталяваньне гэтай арцелі затрачана да 10.000 руб. Трэба адзначыць, што гэта першая арцель у БССР па выпрацоўцы макарону.

ЛІКВІДАЦЫЯ КАМУНЫ «УСХОД».

Віцебск, 26-3. У зьвязку з тым, што камуна „Усход», Межынскага р., распалася на асобныя гаспадаркі і адновілася ад далейшага ўзмацненьня, прэзыдыум АВК парашыў камуну ліквідаваць. Акрэмаддзелу даручана арганізаваць новы с.-г. калектыў з такім разьлікам, каб ён мог сваячасова правесьці пасяўную кампанію.

„АРЦЕЛЬ“ У ЖАНОЧЫМ КЛЯШТОРЫ.

Віцебск, 26-3. З прычыны таго, што ў Тадуліне, Сураскага р., пад відам с.-г. арцелі захаваўся жаночы кляштор, які ў асноўным жыве ад эксплёатацыі рэлігійных пачуцьцяў насельніцтва, прэзыдыум АВК парашыў арцель ліквідаваць.

Райвыканкому даручана ўсю дзяржаўную маемасьць і зямлю скарыстаць дзеля паленшаньня становішча беднаты, арганізаваўшы працоўную арцель, а ў самым кляштору арганізаваць дробныя прадпрыёмствы сел.-гасп. характару.

НОВАЯ ХЛЕБАПЯКАРНЯ.

Віцебск, 27-3. Цэрабкопам у бліжэйшы час будзе пабудована новая хлебапякарня, разьлічаная на 6 печаў. Гэта хлебапякарня зможа выпякаць у дзень каля 450-500 пуд. хлеба.

ПАЖАР У СТАЛЯРНАЙ МАЙСТЭРНІ ПРАЦКАЛЕКТЫВУ.

Гомель, 26-3. 25 сакавіка а 12 гадзіне дню здарыўся пажар у майстэрні па вырабу мэблі. Зусім зьнішчан сталярны цэх майстэрні з усёй мэбляй і поўфабрыкатамі, якія там знаходзіліся. Такарны цэх і суседнія з ім варштаты ўдалося абараніць. Страты дасягаюць прыблізна 11 тысяч р.

Пажар здарыўся ад нядбайных адносін да агню. Вартаўнік, прышоўшы раніцою ў майстэрню, запаліў печку, а сам пайшоў на двор. Калі ён вярнуўся ў памяшканьне, там быў густы дым. У майстэрні ў гэты час нікога ня было. І пакуль вартаўніку ўдалося выклікаць каго-небудзь на дапамогу, сталярны цэх быў ужо ў вагні.

Пад знакам выбараў.

У адным з францускіх гумарыстычных органаў паявілася карыкатура, якая малюе п. п. Рэнодэля, Блюма і іншых іх шаноўных калег у выглядзе цыркавых клоўнаў і акрабатаў, якія выробляюць розныя штукі для таго, каб на час выбараў у маску «сацыялістаў» захаваць і сваю буржуазею падтрымаць. Францускія сацыялісты ў выкіданьне Кузьмы Пруткова на справе даказваюць, што яны здольны «ахавіць неасяжнае» і ветліва пакланіцца рабочай клясе, высоўваючы тыя лёзунгі, якія могуць прыцягнуць да іх рабочых і ў той жа час здрадзіць і прадаць гэтую рабочую клясу буржуазеі. Аб дабрабыце рабочае клясы, аб мерах дамагчыся гэтага дабрабыту, аб сацыяльнай гігіене, нават аб адноўленьні адносінах да Лігі Нацый гаварылі вельмі шмат і ўсё гэта ўвойдзе ў шаную плятформу, а побач з гэтым пытаньне аб падатку на капітал вырашана, згодна патрабаваньням нельзя выклікаюць недавер, не адмовіцца адкінуць партфэль міністра тыповая ... настолькі нагрузіла, але ня ... то з пэрспэктывамі ...

... каналі ... ня можа лічыцца ... ній. Па ёй мы ... ...

... кампаніі ...

Яе члены на пасяджэньні ў габінэце маршала Пілсудскага сядзяць побач з махровымі чорнасоценцамі і чорнасоценцамі-манархістамі, але яна паранейшаму застаецца «бялей сьнегу альпійскіх верхавін»... і ў апазіцыі да ўраду. Галоўная апора гэтага ўраду —«дзеля айчызны», яна, ідучы на выбары, высоўвала патрабаваньні, разьлічаныя на тое, каб рабочыя хоць-бы толькі на час выбараў забылі аб усёй яе здрадніцкай ролі ў сойме і ў часе забастовак і падтрымалі яе сваімі галасамі. Для гэтага ў сваёй выбарчай плятформе яна высоўвае пытаньні і „аб грамадзкім кантролі над прамысловасьцю, і аб нацыяналізацыі пасьпеўшых ужо для гэтых галін прамысловасьці», і аб абароне 8-мігадзіннага рабочага дню, сацыяльнае забясьпекі і г. д. і інш. і нават «аб дэмакратызацыі ўнутранае арганізацыі арміі» у імя лёзунгу: „армія толькі для абароны незалежнасьці краіны, а не для абароны капіталізму».

Пралетарыят Польшчы мусіць успоміну ваеннае клікушаства пэпэсэсаўцаў, як праваліўшы ППС у сойм ацаніў належна шчырасьць гэтых лёзугаў. Але бяз іх нельга было ППС зьявіцца перад рабочымі, нельга было тым больш, што ў выбарах брала ўдзел і кампартыя Польшчы, за якой прышлося ім цягнуцца пад пагрозаю поўнаю разгрому давер'я мас... Гэтыя масы—прычына таму, што і ў пытаньні аб сьпісу кампартыі пэпэсэсаўцы спрабавалі «і нявіннасьць захаваць і капітал нажыць». Яны галасавалі проці скасаваньня камуністычнага сьпісу, разьлічаючы на тое, што буржуазныя партыі будуць галасаваць за скасаваньне, а тыя ўстрымаліся ад галасаваньня, і таму сьпіс ня быў скасаваны. Пакуль...

Гэтая «апазіцыйная» партыя нават у сваёй плятформе менш усяго і мягчэй усяго адносіцца да ўраду маршала Пілсудскага. З ім яна спадзяецца папрацаваць на славу «дарагой айчызны».

Вось якая яна гэтая „сацыялістычная» партыя. Вось „сацыялізм» усіх партый, уваходзячых у склад II-га Інтэрнацыяналу.

Выбары пад дыктатурай франка.

У Францыі п. Пуанкарэ старанна рыхтуецца да выбараў. Ня менш старанна рыхтуецца да выбараў і шэраг іншых капіталістычных краін. 1928 год—год выбараў для Нямеччыны, Францыі, Польшчы, Злучаных Штатаў, а можа таксама і для Англіі. Нават фашысцкая Італія і тая рыхтуецца да выбарчай кампаніі, хоць «парлямант» у ёй фактычна ўжо скасаваны, а замест яго Мусаліні мяркуе сабраць нарыду, напалову назначаную фашысцкіх прафсаюзамі (прадпрыёмцаў і рабочых), напалову абраную вярхоўным фашысцкай партыі.

«выбарчы год» у кіруючых колах Эўропы і Амэрыкі дасьць бяльмі каштоўны матар'ял для ... палітычнай сутнасьці ... стабілізацыйнага пра...

... ніі ...

... ...

... ...

...